А. У. ДАНІЛІШЫНА
Пінск, ДУА «СШ № 2 г. Пінска»

ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРАКТЫЎНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ ДЛЯ НАВУЧАННЯ ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕТАМ ГУМАНІТАРНОГО ЦЫКЛА

Развіццё адукацыі адбываецца ва ўмовах бурнага росту інфармацыі. З распаўсюджваннем лічбавых тэхналогій навучанне набывае новыя формы, становіцца бесперапынным, індывідуальна арыентаваным, гнуткім і дынамічным працэсам. Характэрная асаблівасць сучаснайа дукацыі – медыяграматнасць усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

На працягу апошніх гадоў курсы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў арыентуюцца на развіццё педагагічных кампетэнцый усіх спецыялістаў адукацыі. Прызнаючы патэнцыял інфармацыйных камунікатыўных тэхналогій (ІКТ) для павышэння якасці адукацыі і вырашэння праблем сучаснай адукацыі, кафедры і факультэты рыхтавалі праграмы курсаў са зместам практыкаарыентаваных сучасных методык і тэхналогій. Актуальнасць медыяадукацыі не выкліка есумнення. Школьная медыяадукацыя мае на ўвазе гатоўнасць педагогаў рэалізаваць наступныя мэты:

стварацъ гнуткія вучэбныя планы, у якіх актыўна выкарыстоўваецца медыякантэнт і ўлічваецца пастаяннае абнаўленне рэсурсаў сеткавых ведаў;

адаптаваць вучэбны працэс пад індывідуальныя траекторыі навучання ў гіпермедыяасяроддзі.

Узнікненне і развіццё новых відаў граматнасці, абнаўленне тэхнічных сродкаў навучання і сродкаў камунікацыі, стварэнне адукацыйных суполак выносяць на павестку дня перагляд ролі настаўніка. У новых вучэбных умовах настаўнік працягвае выконваць асноўныя абавязкі: выкладанне і кіраўніцтва працэсам навучання, перадача каштоўнасцей і грамадскіх установак, кантроль за ўмовамі навучання і адукацыйнымі камунікацыямі, ацэнка ведаў вучняў, выхаванне. Але ў дапаўненне да пералічаных функцый настаўнік распрацоўвае кантэкст, мадэлюе сітуацыі і ўмовы для працэсаў выкладання з выкарыстаннем ІКТ, улічваючы валіднасць новаўвядзенняў.

Праграма самаадукацыі медыйнай граматнасці ўключае некалькі паэтапных кампанентаў: аперацыйны, крытычны, творчы і рэфлексіўны. Настаўнік мусіць прайсці гэты шлях да канца. Сам ці з дапамогай прафесіяналаў павінен «абнавіць» сваю кампетэнтнасць, улічваючы спецыфіку выкарыстання ІКТ у працэсе навучання. Для гэтага існуе

сістэма павышэння кваліфікацыі, шэраг інтэрнэт-семінараў, анлайн-курсаў, відэаўрокаў для асваення інтэрактыўных электронных адукацыйных рэсурсаў. Зразумела, што ў сувязі з гэтым настаўніку неабходна фарміраваць або своечасоваабнаўляць канцэптуальныя асновы сваёй медыйнай граматнасці, гласарый настаўніка павінен пашырыцца новымі тэрмінамі, якія характарызуюць класіфікацыю і функцыі электронных адукацыйныхрэсурсаў [1].

У розных грамадскіх сферах паняцце і спосаб прымянення медыйнайграматнасці мае розныя кірункі, у адукацыі можна вылучыць наступныя:

— здольнасць да крытычнага мыслення і творчасці;
— здольнасць рашаць адукацыйныя задачы;
— здольнасць да творчай дзейнасці і камунікацыі [2].

Камунікацыя і творчасць, у агульным, скіраваны на перадачу інфармацыі. А гэты працэс не аднойчы перажываў рэвалюцыйныя змены. Інфармацыйныя рэвалюцыі адбываліся ў нашым грамадстве неаднаразова, таму неабходна выкарыстаць гэтыя веды на карысць сучаснага настаўніка. Навукоўцы вызначаюць нашу эпоху як эпоху камп'ютарных магчымасцей. Сучасны педагог не мае прафесійнага права ігнараваць гэтыя факты. Выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў – патрабаванне часу. Актуальнай з'яўляецца пры гэтым не сама праблема выкарыстання элементаў інтэрнэт-камунікацыі, а карэктнасць і адэкватнасць іх выкарыстання. Віды і формы заданняў, якія можа сёння ствараць настаўнік, самыя разнастайныя. Безумоўна, гэта патрабуе пэўнага часу на авалоданне праграмамі электронных адукацыйных рэсурсаў. Інтэрнэт-рэсурсы ў адукацыйнай прасторы – гэта сайты ўніверсітэтаў, сацыяльныя сеткі, адукацыйныя платформы, навучальныя праграмы і інш. Яны дазваляюць сучаснаму навучэнцу мець доступ да банкаў даных, якія захоўваюць матэрыялы ў велізарным аб'ёме. Маюць магчымасць вольнага інтэрактыўнага доступу да іх элементаў і ўзнаўлення на экране мабільных сродкаў гатовых тэкстаў, ілюстрацый, відэасюжэтаў з гукавым суправаджэннем. Сёння сэрвісы даюць магчымасць правядзення анлайн-тэстаў з функцыяй праверкі і адзнакі.

Ва ўмовах глабалізацыі развіццё інфармацыйных тэхналогій прыводзіць да ўтварэння новых спосабаў выкарыстання інтэрнэту. На сучасным этапе развіцця грамадства, калі мэта адукацыі – стварэнне ўмоў для максімальнага развіцця асобаснага патэнцыялу кожнага вучня, сацыяльныя сэрвісы Web 2.0, асноўныя рысы якіх інтэрактыўнасць і сацыялізацыя, могуць спрыяць павышэнню матывацыі навучання і самому працэсу навучання. У інтэрнэт-прасторы існуе вялікая колькасць платных і бясплатных web-дадаткаў да планшэта, смартфона, якія прапануюць

вывучаць прадмет або набываць дадатковыя веды, самастойна развівацца ў абраным напрамку ў фармаце дапоўненай рэальнасці: ROAR DashboardFree 3D (editor. theroar.io), HP(studio.hpreveal.com), Elicovision, StarWalk2Free, Sketch AR, JigSpace, Google-аб'ектыў, MondlyiOs, Civilisations AR, MindMap AR, Sike(хімія), Elements 4D(animal), QuiverVision.com, GradeCam (стваральніктэстаў), Plickers, Periscope, quizlet.com/goodbye, MIT App INVENTOR (стваральнік адукацыйных вандровак). Для арганізацыі самастойнага індывідуальнага навучання ці працы ў дыстанцыйным фармаце настаўніку неабходна валодаць пэўным інструментарыем. Ёсцьэкспрэс-курсы па дыстанцыйным навучанні, анлайн-канферэнцыі, якія неабходна наведваць, каб засвоіць новыя віды і формы працы. Можна знайсці гатовыя рэкамендацыі па выкарыстанні новых інтэрнэт-платформ з пакрокавым тлумачэннем. Даўно працуеінтэрнэт-платформа Настаўнік.info, дзе прадстаўлены гатовыя для выкарыстання матэрыялы. На сайце размешчаны блокі з распрацаванымі матэрыяламі, рабочымі інтэрнэт-спасылкамі. Настаўнікі выкладваюць гатовыяў рокі па розных прадметах і выкарыстоўваюць платформы Zoom.us, Skype, Hoster.by, FacebookLive для правядзення анлайн-заняткаў, відэаканферэнцый і вэбінараў; Discord для арганізацыі дзелавых сустрэч, чатаў для абмену тэкставымі паведамленнямі, GoogleHanqouts для абмену паведамленнямі, арганізацыі прамых відэа трансляцый. Педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка мае YouTube-канал, дзе размешчаны ўрокі для вучняў I–XI класаў. Можна скарыстаць магчымасці інтэрактыўных рабочых сшыткаў і планаў-канспектаўурокаў edu.skysmart.ru, media.aversev.by. Сёння настаўнікі актыўна карыстаюцца матэрыяламі дыстанцыйных алімпіяд для вучняў VI–VIII класаў «падабайкіроднаймове», матэрыяламі суполкі edusupolka. bloqspot.com, belarusmova.bloqspot.com, «Перакуленыклас» на Facebook, канструктарам урокаўCOREapp, усімі магчымасцямі Google (гугл-дыск, гугл-клас і інш.), групамiViber.

Назіраецца тэндэнцыя росту значнасці электронных адукацыйных сродкаў, але разам з тым настаўнік павінен памятаць, што агульнаметадычныя асновы паспяховага правядзення ўрока тыя ж самыя, незалежна ад тэхналогій і сродкаў, якія ён выкарыстоўвае.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Дзюба, І. А. Інфармацыйна-адукацыйнаеасяроддзесучаснайустановыадукацыі / І. А. Дзюба. – Мінск : АПА. – (Матэрыялыпрэзентацыі).

2. Информационные и коммуникационные технологии в образовании : монография / под ред. Б. Дендева. – М. : ИИТО ЮНЕСКО, 2013. – 320 с.